# ПАЗІЦЫЯ ШЛЯХТЫ ПАД ЧАС ВАЙНЫ РАСІІ І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ 1654–1667 гг.

**А. А. Швед**

Вайна Расіі і Рэчы Паспалітай 1654–1667 гг., несумненна была найбольш крывавай у гісторыі Беларусі. Наступствы яе не асэнсаваны беларускім народам дагэтуль.

Асаблівую цікавасць для нас прадстаўляе становішча вышэйшага стану тагачаснага грамадства – шляхты, як развіваліся яе адносіны з акупацыйнымі ўладамі, замежнымі краінамі і паміж сабой. Для гэтага быў зроблены вертыкальны і гарызантальны зрэз шляхецкага саслоўя. Узнікла пытанне, ці была розніца ў развіцці адносін з рускімі ўладамі ад маёмаснага становішча, паміж магнатамі, дробнай і сярэдняй шляхтай? Якая розніца была паміж шляхтай усходніх і заходніх паветаў ВКЛ?

Папярэднія даследчыкі ў асноўным вывучылі ход ваенных дзеяў і міжнародныя адносіны ў гады вайны, таму ўзнік інтэрэс да канкрэтных асоб і іх уяўленняў аб развіцці падзей.

Багата звестак на гэты конт змешчана ў апублікаваных зборніках дакументаў [1, 2]: справаздачах ваявод, загадах Аляксея Міхайлавіча і Яна Казіміра, пастановак павятовых соймаў і інш.

Як вядома, вайна пачалася ўлетку 1654 г. Асноўным тэатрам ваенных дзеяў на пачатку вайны сталі ўсходнія ваяводства ВКЛ. У выніку непадрыхтаванасці краіны да абароны да канца года маскоўскія войскі захапілі Смаленск, Магілёў, Віцебск і шэраг іншых. На захопленай тэрыторыі ўсталявалася царская адміністрацыя. У выніку мясцовае насельніцтва стала закладнікам сітуацыі. Згодна існаваўшаму заканадаўству (Статут 1588 г.), жыхары павінны былі абараняць краіну пад жахам смяротнага пакарання. Царскія ж войскі абяцалі неразбурэнне пасля павольнай здачы. З адступленнем войск ВКЛ адыходзіла шмат жаўнераў, якія пакідалі расейцам маёнткі, жонак, дзяцей. Каб пазбегнуць канфіскацыі маёмасцяў, у вайсках Я. Радзівіла і В. Корвін-Гасеўскага з'явілася практыка дэзертырства.

Гэтак, смаленскі шляхціц Пётр Корсак не сыйшоў у Літву, а застаўся ў Смаленску, перайшоў у праваслаўе і атрымаў ад цара сялян. Цімошка Грыгор'еў, які служыў у палку Радзівіла, прасіў вярнуць яму захопленых маскоўцамі жонку і дзетак [2, № 626].

Большасць насельніцтва не лічыла панаванне ворагаў працяглым і займала вычакальную пазіцыю.

Нельга абмінуць дзейнасць гэтак званага беларускага палкоўніка Канстанціна Паклонскага. Яго дзейнасць паспрыяла здачы магілёўцамі

горада. Не гледзячы на авантурны характар самаго К. Паклонскага, такі чалавек быў патрэбны цару як прыклад узаемадзеянняў мясцовых фармаванняў з рускімі часткамі. Аднак падобныя атрады не былі надзейнымі і толькі навідавок падтрымлівалі расейскі бок. Гэта праявілася ўжо пад час контрудару Я. Радзівіла на Магілёў вясной 1655 г., калі К. Паклонскі вярнуўся на бок гетмана.

Летняя кампанія рускіх войскаў 1655 г.была ўдалай – захоплена амаль уся сучасная Беларусь, акрамя Брэста і Пінска. Гучным учынкам было прыняцце Аляксеем Міхайлавічам тытула «Вялікі князь Літоўскі і Белыя Ра- сіі». Жыхары княства, якія бачылі немагчымасць хуткага вызвалення массава давалі прысягу на вернасць цару. Аб'ектыўна гледзячы на абставіны, можна зразумець тых людзей. Тыя мяшчане і шляхта, што хаваліся па лясах, вярталіся да дому, каб атрымаць сваю ранейшую маёмасць ужо ад цара, бо на яе зарыліся свае ж суседзі. Шляхта падавала шмат адозваў на імя гасудара, з мэтай атрымаць «нічэйныя» маёнткі. Разумеючы часовасць падобнага ўладання, новыя гаспадары намагалісь атрымаць як мага больш прыбытку.

Дзеля абароны сабе ад гвалтаў і рабаўніцтва жаўнераў і змагання з тымі, хто перайшоў на бок цара, на акупаваных землях узнікаюць партызанскія атрады – г. зв. шышы. Нас у першую чаргу цікавіць удзел у іх прадстаўнікоў шляхты. Цікава, што вышэйшае саслоўе не толькі прымала актыўны ўдзел у руху супраціву, але ўзначальвала і арганізоўвала атрады са сваіх сялян. Казачы галава Лявонцій Ганоўскі ў баі з шышамі 11 ліпеня 1655 г. перамог і адабраў 13 пішчалей, 12 бердышаў, шпа гу [2, № 677]. Віленскі ваявода Шахаўскі дакладаў аб захопе шышоў, пасля рэйду казакаў, абстраляных шышамі з лесу. На допыце палонныя сазналіся, што разам са шляхціцам (!) Станіславам Дакурнам ездзілі ў наваколлі Ашмянаў і забівалі маскоўцаў. Мікалай Яндалаўвініўся, нібыта ён разам з лаўнікам Лаўрэнцьевым і шляхтаю Самойлам і Радутай чалавек з 40 забілі 5 рускіх [2, № 752].

У той жа час наглядалася і адваротная з'ява пераходу на бок расейцаў. Часта гэта адбывалася наступным чынам: стары бацька з кімнебудзь з сыноў заставаўся зберагаць маёнтак пад царскай рукой, за тое астатнія сыны захоўвалі адданасць каралю і служылі ў войску гетманаў.

Тычылася гэта ў асноўным дробнай і сярэдняй шляхты, аднак закранула і магнатэрыю. Найбольш вядомым родам, які гэта зрабіў, былі Агінскія. Віленскі ваявода Шахаўскі прыняў у падданства Самуэля Агінскага (1595–1657), яго сыноў Шымана, падкаморыя віцебскага, і Яна, харунжага ваўкавыскага. У наступным годзе яны вярнуліся на бок кара ля, але важны сам выпадак, бо іх сваякі Аляксандр (брат Самуэля),

кашталян трокскі, і яго сын Марцыян, харунжы трокскі, засталіся на баку караля.

Пераход на бок цара быў звязаны і са складанай знешнепалітычнай сітуацыяй. На працягу 1655–1660 гг. ішла вайна паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай. У ВКЛ існавала прашведская групоўка шляхты, якой не падабаліся бязвольныя паводзіны караля, былога біскупа Яна Казіміра. Гэтую групоўку ўзначальвалі Я. Радзівіл і яго стрыечны брат Б. Радзівіл, канюшы літоўскі. Сродак выратавання краю ад маскоўскай навалы яны пабачылі ў падпісанні ўніі са Швецыяй, якая і была заключана ў Кейданах 17.08.1655 з прадстаўніком Швецыі Магнусам дэ ла Гардзі.

Кейданская ўнія падзяліла шляхту ВКЛ на 2 партыі. Большая частка шляхты не падтрымала саюзу са Швеціяй і засталася пры слабым каралі. Узначальвалі групоўку гетман польны В. Корвін-Гасеўскі, ваявода віцебскі Павал Сапега і падканцлер Крыштап Пац. Прычынай непрыняцця ўніі, на нашу думку, была пазіцыя Радзівілаў у новаўтворанай дзяржаве, якая парушала раўнавагу паміж найбольш моцнымі родамі. Калі адзін род узвышаўся, астатнія аб'ядноўваліся каб аднавіць status quo. Каралеўскі Стакгольм быў далёка, і Радзівілы маглі стаць уладарамі княства.

Яшчэ адным спаборнікам за карону княства быў трансільванскі князь Дзёрдзь Ракоцы, які шукаў падтрымку ў шляхты ВКЛ.

Сцерагаючыся маскоўскай акупацыі, шляхта Пінскага павета выра-шыла, пад ціскам маршалка Лукаша Ельскага, шукаць дапамогі ў Багдана Хмяльніцкага [1, № 96, 98]. Але праз хуткі час адмовіліся, бо гэта «супраць гонару».

На захадзе краіны невялікія залогі расейцаў увогуле не кантралявалі тэрыторыі па-за гарадамі. На апошнім этапе вайны, пад час разгарнуўшагася наступу аб'яднаных войск Кароны і Княства (якія вызваліліс пасля Аліўскага міру са Швецыяй 1660 г.), абсалютная большасць насельніцтва вярталася на бок караля, падымала паўстанні супраць маскоўскіх гарнізонаў у гарадах.

Такім чынам, пераходзячы на бок цара, шляхта ратавала сваё жыццё і маёмасць і вярталася да караля як толькі той змог гарантаваць бяспеку. Спробы ўсталявання саюзаў з суседнімі краінамі (Швецыя, Трансільванія) былі пошукам дапамогі для ўратавання краіны ад расійскай навалы.

**Літаратура**

1. .Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов. Вильна, 1870. Т. 3; 1909. Т. 34.

2. Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. СПб., 1894. Т. 2; 1901. Т. 3.
3. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. СПб., 1863. Т. 3; 1863. Т. 4; 1889. Т. 14.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6-і т., Т. 1–6.
5. *Г. Сагановіч*. Невядомая вайна: 1654–1667.Мн., 1995.

## ВЫДАВЕЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ АДАМА КІРКОРА Ў 40-я гг. XIX ст.

**Т. М. Шырокава**

Вакол постаці А. Г. Кіркора, выдаўцы, публіцыста, уладальніка друкарні, а таксама археолага, этнографа і гісторыка існуе шмат непаразуменняў. Роля, якую Адам Карлавіч адыграў у ідэйным руху ў Вільні ў 40–60-х гадах XIX ст., была такой значнай, што яго імя з'явілася ў большасці прац, якія датычацца гэтага перыяду, але амаль усе яны накіраваны на вывучэнне яго біяграфіі ці ўклада ў этнаграфію і археалогію [1; 2; 6; 8; 9]. Між тым, менавіта выдавецкая дзейнасць А. Кіркора з'яўляецца адным з істотных момантаў яго творчасці. Пэўныя аспекты выдавецкай дзейнасці А. Кіркора прадстаўлены ў польскай гістарыяграфіі. Перш за ўсё трэба адзначыць даследванне М. Штольцман, у якім адведзена значнае месца першым выдаўніцтвам А. Кіркора: «Radegastu» і «Pamiętnikam Umysłowym» і даецца іх грунтоўная характэрыстыка [11]. Аналіз гэтых часопісаў змешчаны таксама ў працы М. Інглота [5] і М. Брэнштэйна [3]. Цікавасць таксама прадстаўляюць артыкул В. Чэхоўскага [4] і рэцэнзія на «Pamiętniki Umysłowe» сучасніка Кіркора Ю. Сікорскага [7].

Праблемамі, якія прыцягваюць нашу ўвагу, з'яўляецца вызначэнне мэтаў, якія ставіў Кіркор падчас сваёй выдавецкай дзейнасці ў 40-я гг. XIX ст., праграма яго выданняў, прынцыпы збору матэрыялаў, а таксама выяўленне прычын заняпаду распачатых ім выданняў.

У 1832–1851 гг. на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай налічвалася 12 штогоднікаў і зборнікаў прац розных ідэалагічных адценняў і літаратурных поглядаў [5, s. 34]. Да іх адносяцца «Biblioteka Warszawska», «Athenaeum» Ю. Крашэўскага, «Rubon» К. Буйніцкага і інш. Можна не браць у разлік «Kurjer Wileńskie», які нават пасля таго, як яго рэдактарам стаў А. Адынец, не карыстаўся вялікай папулярнасцю, бо ў ім падаваліся толькі ўрадавыя палітычныя звесткі, адміністрацыйныя распараджэнні і кароткая хроніка [3, s. 11–12]. Наогул, друк існаваў толькі дзякуючы тытанічным намаганням асобных людзей. Гэта быў час, калі атрымаць дазвол на выданне новага часопіса было амаль немагчыма,